**Праз інтэрнэт – да паэтычных вяршынь**

*С. Г. Абрамовіч,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*першай катэгорыі гімназіі г. Лагойска*

Адной з асноўных задач настаўніка беларускай мовы і літаратуры з’яўляецца выхаванне ў вучняў паважлівых адносін да нацыянальнай спадчыны і традыцый, цікавасці да культуры і мовы свайго народа, што прадугледжвае фарміраванне нацыянальнай самаідэнтыфікацыі школьнікаў. Чалавек, які з дзяцінства чуе родную мову, вывучае беларускія традыцыі, культуру, гісторыю, і ў сталым узросце будзе адчуваць гонар за сваю краіну, свой народ. Грамадству патрэбны адукаваныя, творчыя людзі, таму павінны быць створаны неабходныя ўмовы для развіцця задаткаў і здольнасцей усіх грамадзян. Значная роля ў выяўленні, фарміраванні і развіцці творчых кампетэнцый вучняў адводзіцца настаўніку беларускай мовы і літаратуры.

Ва ўмовах росту сацыяльнай канкурэнцыі маладому чалавеку неабходна быць крэатыўным, умець прымяняць веды, уменні, навыкі, якімі ён валодае, на практыцы, дзейнічаць эфектыўна. Для таго, каб быць запатрабаваным грамадствам, патрэбна, каб дзейнасць насіла творчы характар.

Каб абудзіць у вучняў цікавасць да творчасці, да роднага слова, неабходна арганізаваць спецыяльную развіваючую прастору. У кожнага дзіцяці ёсць пэўныя здольнасці і талент. Дзеці па сваёй прыродзе дапытлівыя, і ўсё , што неабходна, каб яны маглі праявіць свой талент, – гэта разуменне і падтрымка бацькоў і настаўнікаў. І таму абсалютна недапушчальным з’яўляецца фармальны падыход пры выкладанні літаратуры, гэта значыць, што настаўнік павінен пазбягаць шаблоннасці, трафарэтнасці на сваіх уроках.

Сёння асабліва важна заахвочваць і развіваць літаратурную творчасць вучня, а адной з вядучых мэт вывучэння беларускай літаратуры з’яўляецца выхаванне ўдумлівага чытача. Усё часцей можна пачуць нараканні настаўнікаў і бацькоў, што сучаснае пакаленне не цікавіць кніга, яе замяняе яркі манітор камп’ютара, мабільнага тэлефона. Паспрабую прадставіць некаторыя эфектыўныя прыёмы і формы працы, якія дапамагаюць вырашаць “адвечную” праблему фарміравання ўнутранай матывацыі школьнікаў на ўроках літаратуры. Творчыя кампетэнцыі вучняў фарміруюцца паступова ў працэсе актыўнай дзейнасці. Ва ўсіх педагогаў адна мэта – вучыць, развіваць, выхоўваць, але ўсе ідуць да яе рознымі шляхамі.

Кожны настаўнік, які хоча дасягнуць высокіх паказчыкаў пры вывучэнні свайго прадмета, заўжды знаходзіцца ў стане творчага пошуку, менавіта творчы падыход з’яўляецца асноваю педагагічнага майстэрства выкладчыка літаратуры. Зараз цяжка знайсці дзіця, якога б не цікавіў бы камп’ютар. Школьнікі з лёгкасцю асвойваюць новыя інфармацыйныя тэхналогіі, звязваюцца адзін з адным праз электронную пошту, знаёмяцца праз інтэрнэт, гадзінамі гуляюць у камп’ютарныя гульні або падарожнічаюць у віртуальным свеце. Віртуальная цікаўнасць дзіцяці павінна быць выкарыстана настаўнікамі пры рашэнні агульнаадукацыйных і выхаваўчых задач. Пры разумным падыходзе гэта можа стаць моцным імпульсам для інтэлектуальнага, эмацыянальнага і асобаснага развіцця.

Сёння ўжо нікога не здзівіць мультымедыйны ўрок па творчасці пісьменніка, выкарыстанне прэзентацыі пры вывучэнні біяграфіі паэта. А ці магчыма выкарыстаць гэты метад пры вывучэнні лірыкі? На вывучэнне лірыкі ў школьным курсе адведзена прыкладна трэцяя частка часу. Уключаныя ў праграму вершы вызначаюцца тэматычнай і жанравай разнастайнасцю. Сучасная методыка назапасіла багаты арсенал форм, метадаў і прыёмаў работы па вывучэнні лірычных твораў. Многім вучням – асабліва ў рускамоўных навучальных установах – цяжка ўспрымаць беларускую мову. Каб зразумець верш, яго асноўную думку, ідэю, патрэбна ўглядацца ў кожнае слова, задумвацца над кожным радком. Выразнага чытання для гэтага недастаткова.

Я прапанавала вучням у якасці эксперыменту **стварыць прэзентацыю да верша**. Спачатку здавалася, што крок вельмі смелы –аб’яднаць лірычны твор і камп’ютар, паэзію і інтэрнэт.

Зараз гэты прыём выкарыстоўваю даволі часта. Вучням падабаецца. Па іх словах, знайсці ў інтэрнэце фотаздымак на патрэбную тэму не цяжка, а вось каб выбраць з мноства прапанаваных варыянтаў адзіны, які б найбольш дакладна адлюстраваў аўтарскую пазіцыю, – над гэтым прыходзіцца задумвацца, разважаць, аналізаваць твор. Звычайна пры абароне сваіх творчых работ, прэзентацый вучні чытаюць творы па памяці, што садзейнічае развіццю і ўдасканаленню моўнай кампетэнцыі.

























Праз некаторы час з’явілася жаданне паспрабаваць выразіць аўтарскае бачанне не праз фотаздымак, а праз малюнак, што намнога цяжэй і патрабуе спецыяльных навыкаў. Менавіта гэта форма працы была пакладзена ў аснову праекта “Заўсёды з намі Колас і Купала”. Гэты праект прымаў удзел у другім эспубліканскім конкурсе творчых і навукова-даследчых вучнёўскіх работ часопіса “Роднае слова” і грамадскага аб’яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі”, дзе быў адзначаны дыпломам I ступені ў намінацыі “Да 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа”.














Работа над праектам садзейнічала развіццю творчых кампетэнцый вучняў, фарміраванню навыкаў праектнай дзейнасці, навыкаў успрымання мастацкага твора праз малюнак, а таксама творчай самарэалізацыі гімназістаў. Дзяўчынкі з задавальненнем дэманстравалі вынікі сваёй творчасці, ім было прыемна паказаць свае здольнасці. Сувязь твораў літаратуры і жывапісу дазволіла вучням больш дакладна ўсвядоміць спецыфіку паэзіі як мастацтва слова, развіць здольнасці бачыць свет ва ўсёй

разнастайнасці фарбаў, колераў, форм. Малюнкі вучняў напоўнены пачуццём вялікай любові да паэзіі Янкі Купалы і Якуба Коласа, удзячнасцю за іх талент і працу. Дадзены від дзейнасці зацікавіў вучняў творчасцю беларускіх пісьменнікаў, заахвоціў да чытання іх твораў.

Развіццю творчых кампетэнцый вучняў неабходна ўдзяляць асаблівую ўвагу. Наўрад ці заўтра ўсе нашы выхаванцы стануць пісьменнікамі, журналістамі, тэлевядучымі, а вось абараніць свае перакананні, погляды, творча ўключыцца ў працэс міжасобаснай камунікацыі спатрэбіцца кожнаму.

Сучаснае грамадства прад'яўляе да чалавека ўсё больш высокія патрабаванні, таму і сучасная школа патрабуе новага настаўніка, які ўмее арыентавацца ў новых умовах, заўжды знаходзіцца ў стане творчага пошуку, не толькі дае пэўныя веды, а садзейнічае фарміраванню, удасканаленню інтэлектуальных і творчых кампетэнцый вучняў.